Іван ЦІХАН:

# «Судзіцца з МАКам было надзвычай складана. У той жа час вельмі цікава»

**Учора ў Мінску, у САК «Алімпійскі», прайшлі урачыстасці, прысвечаныя 50-годдзю Алімпійскіх гульняў у Рыме-1960 і 30-годдзю маскоўскай Алімпіяды-80. Падчас цырымоніі адбылася яшчэ адна, бадай самая важная і прыемная падзея — медалі апошняй летняй Алімпіяды, пекінскай, былі ўручаныя, дакладней вернутыя, нашым малатабойцам — Івану Ціхану і Вадзіму Дзевятоўскаму.**

Зноў з медалямі, на гэты раз канчаткова.



Фота БЕЛТА.

Леанід Гейштар і Сяргей Макаранка, першыя з беларусаў, хто заваяваў алімпійскае золата ў Рыме-1960, у сваім паважаным узросце для сваіх калег па спорце дагэтуль «Лёня і Сярожа». Павіншаваць іх, а таксама яшчэ адну ўдзельніцу той Алімпіяды, Марыю Іткіну, прыйшло шмат калег, сяброў і спартыўнага кіраўніцтва. На маскоўскай Алімпіядзе ўжо нашмат больш беларусаў сталі ўладальнікамі трафеяў. 29 нашых суайчыннікаў у складзе зборнай СССР сталі тады чэмпіёнамі і прызёрамі. Яны таксама атрымалі віншаванні і ганаровыя знакі Нацыянальнага алімпійскага камітэта.

Але найбольшы ажыятаж у прысутных выклікала з'яўленне ў зале Івана Ціхана і Вадзіма Дзевятоўскага. Хоць яшчэ некалькі тыдняў таму стала вядома, што Спартыўны арбітражны суд у Лазане прыняў рашэнне на карысць нашых легкаатлетаў, медалі ім былі вернутыя толькі цяпер. Афіцыйная прэс-канферэнцыя Вадзіма і Івана, а таксама іх англійскага адваката адбудзецца сёння. Але мы пагутарылі з **трохразовым чэмпіёнам свету, бронзавым прызёрам Алімпіяды ў Пекіне Іванам ЦІХАНАМ**, які расказаў «Звяздзе», як ён правёў амаль два гады, калі ішлі судовыя разборы, хто падтрымліваў спартсменаў у гэты няпросты час, ці атрымаюць яны належныя ім прэміяльныя, і чаму яны ні на каго не крыўдзяцца. Хоць адразу хочацца заўважыць, што Іван, як і раней, чалавек надзвычай далікатны і дыпламатычны, які па-філасофску ці па-жыццёваму мудра ставіцца да многіх рэчаў.

***— Іван, раскажыце, як правялі апошнія два гады. Чым займаліся: трэніраваліся ці, магчыма, адпачывалі ад спорту?***

— Калі ідзеш па жыцці, робіш нямала памылак. У нас у гэты час было іх шмат. Нас трэба было «захаваць», каб мы ў лепшай форме падышлі да вяртання ў вялікі спорт. Трэніраваліся, вядома ж, але не ў поўную сілу. Не бачылі мэты. Таму паўнацэнных трэніровак не было.

***— Вам не чынілі перашкоды?***

— Ведаеце, у рабочага нельга забраць інструмент і выконваць яго працу. У нас вельмі цяжкая праца, і наўрад ці яе захоча нехта ўзяць на сябе.

***— Вы пабачылі так званы адваротны бок медаля. Якой была на гэта ваша першая рэакцыя тады, два гады таму?***

— Калі шчыра, я спачатку не паверыў. Меркаваў, што МАК так жартуе, хочуць, каб я прыехаў, каб сказаць мне штосьці прыемнае.

***— Вашы трэніроўкі нават для падтрымання сябе ў форме адбываліся за ўласны кошт? Вас жа пазбавілі ўсіх прэміяльных, выплат і стыпендый. За што вы жылі гэтыя два гады?***

— Нас падтрымлівала спартыўнае таварыства «Дынама» на чале з Юрыем Бародзічам. Яно да канца было на нашым баку і дапамагала ўвесь гэты час.

***— Была магчымасць паехаць кудысьці на зборы, хоць бы ў блізкае замежжа?***

— Не. Безумоўна, была магчымасць захаваць нас у значна лепшай, чым цяпер, форме, стварыць лепшыя ўмовы. Але калі прад'явілі абвінавачванні, мы з Вадзімам засяродзіліся на гэтай праблеме, і адпаведна, па мінімуму падтрымлівалі форму.

***— Вам вернуць цяпер стыпендыі, прэміяльныя, кватэры — усё тое, што атрымалі астатнія прызёры Алімпіяды?***

— Мы бачылі паперы, у якіх былі гарантыі таго, што нам вернуць нашы прэміяльныя, заработныя платы за той час, які мы іх не атрымлівалі. Нам застаецца толькі верыць гэтым паперам і словам нашых спартыўных кіраўнікоў.

***— Вы казалі, што толькі БФСА «Дынама» падтрымлівала вас да канца...***

— Мы не былі дыскваліфікаваныя, мы былі толькі адхіленыя. І таму ж міністэрству, і федэрацыі, на мой погляд, можна было крыху мякчэй з намі абысціся...

***— Крыўдна?***

— Не. Яны прынялі такое рашэнне і дзейнічалі ў межах закона. Калі яны так вырашылі, гэта іх права. Калі крыўдзіцца на ўсіх запар, не хопіць ні сілаў, ні часу, каб працаваць.

***— Ваша справа не мела прэцэдэнтаў. Дагэтуль спрачацца з МАКам у допінгавых справах было бесперспектыўным. Вы самі верылі ў сваю перамогу?***

— Мы з Вадзімам — два розныя чалавекі. Нягледзячы на тое, што мы з адной краіны, трэніраваліся мы ў розных месцах. І тое, што ў допінг-тэстах у нас абсалютна аднолькавыя паказчыкі — такое хіба што ў блізнят магчыма. Неяк дзіўна выглядала, што мы з Вадзімам быццам бы прынялі адзін і той жа прэпарат у адзін і той жа час у аднолькавай дозе. Гэта першае, што выклікала здзіўленне. Акрамя таго, спецыялісты, якія з намі працавалі, вывучыўшы дакументы, пацвердзілі, што ёсць сур'ёзныя парушэнні. Таму ў пэўнай ступені было вельмі складана. У той жа час было вельмі цікава.

***— Пекінская лабараторыя будзе неяк пакараная? Атрымліваецца, што можна неакуратна браць аналізы, абвінавачваць спартсменаў у допінгу, якіх потым пазбаўляць медалёў і дыскваліфікаваць...***

— Мы не маем права абвінавачваць лабараторыю. Мы проста паказалі на іх памылкі, з якімі нельга выносіць рашэнне.

***— Вы лічыце, гэта нармальна, што на Алімпіядзе пробы бяруцца з такімі памылкамі?***

— Я не магу абвінаваціць лабараторыю. Разбор з ёй няхай праводзіць Міжнародны алімпійскі камітэт. Асабіста мы нікога за руку не злавілі. Мы прадэманстравалі, што ў дакументах, якія нам прад'явілі, ёсць памылкі.

***— У выніку пакутавалі вы, у тым ліку і матэрыяльна...***

— Людзі заўсёды пакутуюць. 50 тысяч еўра кампенсацыі ад МАК мы атрымаем.

***— Цяпер вы паўнавартасна трэніруецеся?***

— Сапраўдныя трэніроўкі пачынаюцца тады, калі бачная мэта і калі ёсць умовы. Мэта ўжо ёсць, а вось умоў пакуль няма. Цалкам да трэніровак не прыступаў.

***— Як будзеце адчуваць сябе цяпер на спаборніцтвах, калі вам вось так крыху сапсавалі рэпутацыю?***

— Рэпутацыя сапсаваная тады, калі ты выйшаў у сектар і нічога не паказаў. У нашым выпадку, інакш.

***— Бліжэйшы старт — Алімпіяда ў Лондане?***

— Так. Але калі буду ў добрай форме, можна і раней. Чэмпіянат свету будзе ў наступным годзе, калі будуць добрыя вынікі, можна ехаць. Я, на жаль, ужо не дзейны чэмпіён свету, таму трапіць без адбору туды не атрымаецца...

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# ВОІНЫ-ЧЫГУНАЧНІКІ АДЗНАЧАЮЦЬ СВАЁ 134-Е ПРАФЕСІЙНАЕ СВЯТА

**Сёння, 6 жніўня, сваё прафесійнае свята адзначаюць транспартныя войскі — Дзень чыгуначных войскаў. Напярэдадні гэтай даты з журналістамі на базе 307-й асобнай чыгуначнай брыгады (г. Слуцк) сустрэўся генерал-маёр Віталь КІРЭЕЎ, начальнік дэпартамента транспартнага забеспячэння Міністэрства абароны.**

— Гісторыя чыгуначных войскаў бярэ пачатак з будаўніцтва першых чыгунак у Расійскай Імперыі. Паралельна з гэтым будаўніцтвам ствараліся чыгуначныя батальёны, і адзін з першых такіх батальёнаў дыслакаваўся ў Беларусі ў Баранавічах са жніўня 1876 года, з яго і пачалася гісторыя чыгуначных войскаў Беларусі, — сказаў Віталь Кірэеў.

З тых часоў воіны-чыгуначнікі паспелі паўдзельнічаць у некалькіх войнах, пачынаючы з руска-турэцкай і заканчваючы Вялікай Айчыннай вайной, яны таксама бралі ўдзел у ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС. У гісторыі Рэспублікі Беларусь як незалежнай дзяржавы чыгуначныя войскі пачалі існаваць з 1992 года, а ў 2006 годзе на базе чыгуначных, аўтамабільных і дарожных войскаў былі створаны транспартныя войскі Рэспублікі Беларусь.

Да 2015 года на ўзбраенні ў транспартных войскаў павінен з'явіцца мост-стужка, які заменіць стары наплаўны чыгуначны мост.

— Мы будуем пад'язныя шляхі да торфапрадпрыемстваў, рэканструюем і будуем дарогі і іншыя складаныя збудаванні, у двух ваенных лясгасах будуем дарогі ў вельмі цяжкіх умовах, — сказаў Віталь Кірэеў.

Пры гэтым транспартныя вайскоўцы забіваюць двух зайцоў адначасова: і вучаць, і зарабляюць грошы.

— Мы выконваем задачы баявой падрыхтоўкі і адначасова ўдзельнічаем у тэндарах, заключаем дамовы з тымі ці іншымі арганізацыямі, — патлумачыў начальнік дэпартамента транспартнага забеспячэння. — Такім чынам Міністэрства абароны не траціць грошы на падрыхтоўку войскаў, мы іх самі зарабляем: арганізацыі нам плацяць за ГЗМ, камандзіровачныя выдаткі, будаўнічыя матэрыялы. Прыбытак мы накіроўваем на развіццё войскаў: дэпартамент не забірае грошы — усё ўкладваецца ў развіццё казарменна-жыллёвага фонду, вытворчай базы, вучэбна-матэрыяльнай базы і інш.



Салдаты з 307-й асобнай чыгуначнай брыгады трэніруюцца хутка наладжваць чыгуначную пераправу цераз рэчку.

— Некаторыя недалёкія людзі заяўляюць сёння, што ў нас тыя ж задачы, як пры Савецкім Саюзе ў будаўнічых войскаў. Мы сёння абсалютна не тыя войскі. Калі раней нам не надаваўся прыярытэт, то цяпер іншая сітуацыя. Сёння ў транспартных войсках няма той цяжкай фізічнай працы — яна замяняецца машынамі і механізмамі.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## Раскрылі забойства 14-гадовай даўнасці

**52-гадовы барысаўчанін, які больш за 14 гадоў таму забіў чалавека, з'явіўся ў міліцыю з пакаяннем.**

Ён прызнаўся, што вясной 1996 года каля 17.30 вечара, за аўтобусным прыпынкам, размешчаным у ваенным гарадку «Лядзішча» ў Барысаве, на п'яную галаву пасварыўся з мінаком. Падчас высвятлення адносінаў ударыў незнаёмца нажом у вобласць сэрца. Апошні памёр на месцы здарэння. У той жа дзень у аўтамашыне каля барысаўскай крамы «Алі» тым жа нажом нанёс некалькі ўдараў у вобласць твару, шыі і кісцей рук яшчэ аднаму незнаёмцу, з якім выпіваў у кампаніі. На шчасце, пацярпелы ўмудрыўся выбегчы з машыны на вуліцу, і яму своечасова аказалі медыцынскую дапамогу.

Сваю віну ў забойстве і спробе забойства барысаўчанін прызнаў цалкам, — паведаміла **старшы памочнік пракурора Мінскай вобласці Таццяна КАЛІНІНА**. — Паводле яго слоў, узяўся за нож, бо баяўся, што ў яго будуць вымагаць грошы. Маўляў, раней ён ужо падвяргаўся вымаганням з боку незнаёмцаў. 14 гадоў пасля ўчынення злачынстваў мужчына хаваўся ад органаў крымінальнага пераследу, ільвіную долю гэтага часу жыў у Барысаве пад выдуманым імем. Што яго прымусіла пакаяцца? Кажа, што стаміўся жыць з такім цяжкім грузам шмат гадоў. Да таго ж, падчас правядзення дактыласкапіравання насельніцтва (у сувязі з расследаваннем выбуху ў Мінску ў Дзень Незалежнасці два гады таму) у яго таксама ўзялі адбіткі пальцаў рук, таму мужчына палічыў, што яго абавязкова знойдуць.

Мінскі абласны суд прыгаварыў барысаўчаніна да 13 гадоў пазбаўлення волі. Нядаўна прысуд увайшоў у законную сілу.

**Надзея ДРЫЛА.**

## У Быхаўскім раёне рыхтуюць «Вялікую бард-рыбалку»

**У пасёлку Грудзічына збяруцца аматары аўтарскай песні і рыбнай лоўлі. На беразе Чыгірынскага вадасховішча з 26 па 29 жніўня пройдзе міжрэгіянальнае музычна-спартыўнае свята.**

Фестываль, дзе будуць спалучацца песня і рыбалка, прыдумалі барды, якія захапляюцца лоўляй рыбы. Імкненне спалучыць гэтыя дзве любімыя справы падтрымалі быхаўскія ўлады. Быхаўскі раён — лідар па развіцці аграэкатурызму на Магілёўшчыне, а Чыгірынскае вадасховішча — самае вялікае ў вобласці.

Цэнтрам бард-рыбалкі будзе аграсядзіба «Пясчаны бераг», якая ў паўсотні кіламетраў ад Магілёва. Арганізатары абяцаюць прыняць болей за тысячу гасцей. Пра свой удзел заявілі вядомыя мэтры аўтарскай песні: напрыклад, Леанід Сяргееў з Масквы, Віктар Шалкевіч з Гродна і Аляксандр Баль з Магілёва, які, дарэчы, нядаўна зняў кліп на песню «Рыбацкая».

Ганаровым госцем будзе на фестывалі Дзмітрый Сухараў, які з'яўляецца аўтарам вершаў да вядомай песні «Аляксандра» з кінафільма «Масква слязам не верыць». Паэту ўжо 79 гадоў, ён прыедзе на Быхаўшчыну разам з жонкай і ўнучкай.

Натуральна, што конкурсаў будзе два: аўтарскай песні і рыбаловаў-аматараў. Акрамя гэтага, плануецца «Ноч класічнай гітары» і гала-канцэрт бардаў. Яны пройдуць на пантоннай сцэне на вадзе, а глядацкай залай стане бераг вадасховішча.

Акрамя гэтага, запланаваны экскурсіі і прагулкі на конях і лодках, катанне на катамаранах, гатаванне юшкі і шмат што іншае. Каб трапіць на свята, трэба будзе заплаціць 5 тысяч рублёў, а каб яшчэ размясціцца ў палатачным лагеры — 10 тысяч рублёў.

Калі вы хочаце ўдзельнічаць у бард-рыбалцы, то заяўку можна размясціць на сайце www.fish.bardy.org.

**Ілона ІВАНОВА.**

## Абзац

◢ **Гандлёвы цэнтр «Сталіца» на плошчы Незалежнасці ў Мінскуператворыцца 7—8 жніўня ў арэну віртуальных бітваў. Тут пройдзе беларускі адборачны тур Сусветных камп'ютарных гульняў (WCG — World Cyber Games). У фінальных спаборніцтвах па Counter Strike 1.6 і Fifa возьмуць удзел наймацнейшыя кіберспартсмены Беларусі, якія прайшлі ў фінал па выніках адборачных гульняў. Упершыню Сусветныя камп'ютарныя гульні былі праведзены ў 2000 годзе ў Паўднёвай Карэі. Тады ў іх узялі ўдзел прадстаўнікі 33 дзяржаў. Кіберспартыўны рух хутка набраў абароты, і сёлета сталіца камп'ютарнай алімпіяды — амерыканскі горад Лос-Анджэлес збярэ лепшых гульцоў з больш чым 70 краін. Агульны прызавы фонд WCG складае $500 тыс.**

◢ Аператар life:) працягвае заставацца ў мінусе. Даходы беларускай кампаніі хоць і выраслі за першае паўгоддзе амаль у 6 разоў (з $3,6 млн да $21,6 млн) у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, але ўсё яшчэ істотна адстаюць ад затрат. Раней прадстаўнікі кампаніі паведамлялі, што да канца 2010—пачатку 2011 года Turkcell плануе правесці дадатковы плацеж у 100 млн долараў. Па дамоўленасці з інвестарам гэты плацеж можа быць ажыццёўлены пасля атрымання ЗАТ «БеСТ» станоўчага гадавога даходу — значыць, у гэтыя тэрміны кампанія і плануе выйсці ў плюсы.

◢ **Магілёўскія мытнікі канфіскавалі 35 т кавуноў. Яны выявілі тры факты перамяшчэння і захоўвання кавуноў на тэрыторыі краіны без адпаведных таварасуправаджальных дакументаў. Папярэдні ацэначны кошт канфіскаваных кавуноў склаў каля 54 млн рублёў. Канфіскаваны тавар вернуты ў даход дзяржавы і ў найбліжэйшы час паступіць у гандлёвую сетку Магілёўскай вобласці. 8 т кавуноў не прайшлі гігіенічнай экспертызы і былі знішчаны.**

◢ Пачаць рэканструкцыю касцёла Божага Цела ў Нясвіжы плануецца ў сёлетнім верасні-кастрычніку.

◢ **Падчас спецыяльнага мерапрыемства ў ППМА «Урбаны» супрацоўнікі Віцебскай мытні затрымалі пры ўездзе ў краіну грузавы аўтамабіль грамадзяніна Літвы. У аўтамабілі перавозілася касметыка. У ходзе агляду было ўстаноўлена, што колькасць тавару, якая фактычна знаходзілася ў транспартным сродку, значна перавышае колькасць, пазначаную ў таварасуправаджальных дакументах. Агульны папярэдні ацэначны кошт незадэкларыраванай касметычнай прадукцыі склаў каля 1,5 млрд рублёў.**

◢ На метэастанцыях Касцюковічы Магілёўскай вобласці і Брагін Гомельскай вобласці дасягнуты рэкордныя тэмпературы паветра дня 4 жніўня: у Касцюковічах было плюс 37,5 градуса, у Брагіне — 37,9 градуса. Пры гэтым тэмпература паветра ў Брагіне стала новым рэкордам гэтага лета. Ранейшыя тэмпературныя рэкорды ў Брагіне і Касцюковічах, якія дасягалі 37 градусаў, утрымліваліся з 1946 года. Высокія тэмпературы паветра адзначаліся на метэастанцыях Азярышча, Віцебск, Орша, Сянно, Горкі, Слаўгарад, Чачэрск — ад 36,8 да 37,5 градусаў. Тут таксама пабітыя абсалютныя рэкорды лета.

◢ **На поўдні Бразіліі незвычайна халоднае надвор'е прывяло да самых моцных за апошнія 10 гадоў снегападаў. Тэмпература паветра ў некалькіх высакагорных гарадах апусцілася амаль да 4 градусаў ніжэй за нуль, а ў сувязі з павышанай вільготнасцю і парывістым ветрам такія ўмовы надвор'я тут параўнальныя з сямнаццаціградуснымі маразамі. Снегапады маюць анамальны характар, бо снег у Бразіліі вялікая рэдкасць. У апошнія тыдні моцнае пахаладанне назіраецца і ў некаторых іншых краінах Лацінскай Амерыкі.**

◢ У раздзелах львоўскіх газет аб працы заўважаны заманлівыя прапановы для жанчын. 4000 грн можна атрымаць у мясцовым медыцынскім цэнтры, дзе вырашаюць праблему бясплоднасці, за здачу яйцаклетак. У большасці еўрапейскіх краін па этычных і рэлігійных меркаваннях донарства аацытаў забаронена. Але яно шырока практыкуецца ва Украіне, у Расіі, у Казахстане, а таксама ў ЗША і Канадзе. Такі крок жанчын нельга разглядаць як добраахвотную дапамогу, гэта, хутчэй, безвыходнасць, на якую штурхае цяжкае фінансавае становішча. Невыпадкова падобныя аб'явы размяшчаюцца ў раздзеле «праца» — там, дзе шукаюць заробак перш за ўсё. Такія дзеці ніколі не даведаюцца пра сваё сапраўднае паходжанне. Ці лёгка даведацца, што твае бацькі прадалі цябе задоўга да нараджэння чужым людзям.

## Поўны абзац

◢ **Колькасць амерыканцаў, якія пакутуюць ад атлусцення, перавысіла насельніцтва Турцыі. А гэта больш за 72 млн чалавек. З 2007 па 2009 год колькасць жыхароў, якія пакутуюць ад атлусцення, павялічылася на 2,4 млн чалавек і дасягнула 26,7 % насельніцтва. У дзевяці амерыканскіх штатах доля поўнага насельніцтва перавышала 30 %. Вучоныя высветлілі, што амерыканскія негры больш схільныя да атлусцення, чым іншыя этнічныя групы ЗША. У прыватнасці, сярод дарослых афраамерыканцаў доля поўных людзей склала 36,8 %, а сярод чарнаскурых жанчын — больш за 41 %.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

# МАСТАЦКАЯ ГІМНАСТЫКА ВЫХОДЗІЦЬ З АДПАЧЫНКУ

### У Мінску пройдзе 9-ты турнір на прызы Марыны Лобач

**Гімнасткі з васьмі краін свету прыедуць у Мінск, каб узяць удзел у спаборніцтвах на прызы алімпійскай чэмпіёнкі Марыны Лобач. Міжнародны турнір, які праводзіцца ў дзявяты раз, пройдзе сёлета 6-7 жніўня ў сталічным Палацы спорту. Каля 70 спартсменак з Казахстана, Венгрыі, Малдовы, Латвіі, Расіі, Фінляндыі, Эстоніі і Беларусі будуць спаборнічаць у трох узроставых катэгорыях.**

Як расказала Марына Лобач, якая з'яўляецца не толькі гаспадыняй турніру, але і па традыцыі яго галоўным суддзёй, з-за перагружанасці календара спаборніцтваў сёлета гэтае мерапрыемства вырашана было перанесці з вясны на жнівень. І яно стане першым пасля летняга перапынку этапам падрыхтоўкі да чэмпіянату свету, які пройдзе ў Маскве ў верасні. Для некаторых спартсменак спаборніцтвы ў Мінску будуць і апошняй спробай сілаў перад І юнацкімі Алімпійскімі гульнямі ў Сінгапуры. Нашу краіну ў мастацкай гімнастыцы там прадставіць Наталля Лушчык. На турніры Марыны Лобач выступяць і вядомыя беларускія гімнасткі — лідары нацыянальнай каманды Меліта Станюта і Ганна Рабцава, а ў паказальных выступленнях — Любоў Чаркашына, а таксама нацыянальная каманда ў групавых практыкаваннях.

Паводле прызнання бронзавага прызёра чэмпіянату свету-2009 Меліты Станюты, у гімнастычным асяроддзі турнір Марыны Лобач заваяваў рэпутацыю цёплых і жыццярадасных спаборніцтваў, і многія спартсменкі з радасцю на яго хацелі б прыехаць. Праўда, узрост удзельніц абмежаваны — у самай старэйшай катэгорыі — сеньёрак — сёлета выступяць дзяўчаты 1993—1994 г.н. Акрамя прызоў Марыны Лобач, усе ўдзельніцы турніру атрымаюць сувеніры і падарункі ад Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, які не першы год падтрымлівае гэтыя спаборніцтвы. А самая юная ўдзельніца атрымае спецыяльны прыз, які заснавала беларуская федэрацыя гімнастыкі.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## Крымінал

### МЕНЕДЖАР ТУРФІРМЫ ПАДМАНУЛА ТУРЫСТАЎ НА $20 ТЫС.

**Менеджар па фарміраванні турпрадукту, якая працавала па дагаворы падраду ў ПУП «Свет фантазій», падманула 24 турысты на $20 тыс. Пра гэта БЕЛТА паведаміў намеснік дырэктара дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Беларусі Андрэй Мартынаў.**

На ПУП «Свет фантазій» паступіла скарга ад турыста, які за дзень да вылету выявіў, што прадстаўніца турфірмы выдала яму фальшывыя авіябілеты. Усяго ж ад дзейнасці менеджара пацярпелі 24 турысты. На яе заведзена крымінальная справа па факце махлярства. «Гэта адна з самых буйных афер, якія адбыліся за апошнія гады на турыстычным рынку Беларусі», — прызнаў Андрэй Мартынаў. Так, менеджар заключала дамовы прама ў офісе турфірмы, а дырэктар і чатыры супрацоўніцы, паводле іх слоў, нават не здагадваліся аб махлярстве. Прычым каб падмануць турыстаў, яна сканіравала сапраўдныя дакументы (напрыклад, авіябілет), непрыкметна прастаўляючы ў іх іншыя прозвішчы і даты. Як расказала дырэктар турфірмы Таццяна Камароўская, да суда вяртаць грошы турыстам яна не плануе.

### КРАЛІ ПАЛІВА ДЫ «ПАПАЛІЛІСЯ»

**Траіх беспрацоўных жыхароў Оршы, якія шляхам несанкцыянаванай урэзкі ў магістральны нафтапрадуктаправод ПВУП «Захад-Транснафтапрадуктаправод» кралі дызельнае паліва, затрымалі на месцы злачынства.**

На месцы здарэння — раён вёскі Бараўцы Аршанскага раёна — аператыўнікі знайшлі 3 ёмістасці па 1000 літраў кожная, у якіх знаходзілася 1500 літраў дызельнага паліва. Пры вобыску па месцы жыхарства ў зламыснікаў дадаткова канфіскавана яшчэ 3000 літраў паліва.

— Высветлілася, — паведамілі «Звяздзе» ў прэс-цэнтры МУС, — што мужчыны і раней ажыццяўлялі несанкцыянаваныя ўрэзкі ў згаданы нафтапрадуктаправод. Дарэчы, двое з іх раней ужо былі судзімыя за крадзяжы.

**Надзея ДРЫЛА.**

## Ну і ну!

### НЕПЛАЦЕЛЬШЧЫКІ, ЯКІМ ЗАБЛАКАВАЛІ КАНАЛІЗАЦЫЮ, ПАЧАЛІ ПАГАШАЦЬ ДАЎГІ ПА КАМУНАЛЬНЫХ ПЛАЦЯЖАХ

**Новы спосаб уздзеяння на даўжнікоў, якія не плацілі па рахунках на працягу некалькіх гадоў, сталічныя камунальнікі апрабавалі 28 ліпеня. У дзвюх кватэрах дома № 9 на вуліцы Карбышава пры дапамозе спецыяльнай прылады адключылі каналізацыю (гарачая вада, электраэнергія, газ ужо былі перакрытыя).**

У адной з кватэр, доўг па якой набліжаўся да дваццаці пяці мільёнаў рублёў, разам з гаспадыняй-пенсіянеркай зарэгістраваны і жывуць двое дарослых працаздольных сыноў. Як паведаміла дырэктар ЖЭУ-61 Іна Ясінская, праз сем дзён пасля блакіроўкі сістэмы водаадвядзення гэта сям'я пагасіла асноўны доўг у памеры 3,5 млн рублёў. Засталася пеня амаль у 20 млн рублёў. Згодна з законам, яе можна спісаць — рашэнне прымаюць у адміністрацыі раёна, улічваючы плацежаздольнасць і матэрыяльнае становішча заяўніка.

— Акрамя платы асноўнага доўгу жыхарам яшчэ неабходна ўнесці 110 тыс. рублёў за выкананую блакіроўку і наступную разблакіроўку сістэмы водаадвядзення, — адзначыла Іна Ясінская. — Што датычыцца газу, вады і электраэнергіі, трэба разлічыцца па даўгах, якія ёсць, і заплаціць за падключэнне гэтых паслуг. Як толькі названыя плацяжы будуць зроблены, на працягу трох дзён у кватэры будуць адноўлены камунальныя паслугі.

**Аляксандр ФІЛІПОВІЧ, «Мінск-Навіны».**

### ВЭНДЖАНІНАЙ СТАЛА ЎСЁ

Тры пажары за мінулыя суткі зафіксаваны на Гомельшчыне, але абышлося без ахвяраў. У вёсцы Хальч Веткаўскага раёна пацярпела ад моцнага задымлення крама Веткаўскага райспажыўтаварыства. Знішчаны прылавак з касавым апаратам, які «замкнула». Гэты апарат, на думку спецыялістаў цэнтра прапаганды і навучання Гомельскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях, і стаў прычынай здарэння. Дарэчы, грошы былі ў іншым месцы — сейфе загадчыцы, і таму страты ацэньваюцца толькі ў 10 мільёнаў рублёў: пашкоджана халадзільнае абсталяванне, моцна закураны столь і прадукты.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРИВАТИЗАЦИИ

## ОТКРЫТЫЙ КОНКУРС ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ПРИВАТИЗАЦИИ КОММУНАЛЬНОЙ СОБСТВЕННОСТИ Г. МИНСКА

**состоится 8 сентября 2010 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. № 310.**
**Продавец и организатор конкурса: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8**
**тел. (8017) 200 20 89, каб. 227.**

**На конкурс выставляются:**

| № лота | | лот № 1 | лот №2 | лот № 3 | лот №4 |
|---|---|---|---|---|---|
| Предмет конкурса | | Структурное подразделение КУП «Бытэкс» (прачечная самообслуживания) | Структурное подразделение ПТ КУП «Чайка» (прачечная самообслуживания) | Структурное подразделение КУП «Бытэкс» (прачечная самообслуживания) | Структурное подразделение КУП «Бытэкс» (прачечная самообслуживания) |
| Место нахождения предмета конкурса | | г. Минск, пер. Северный, 17 | г. Минск, ул. Пожарского, 27 | г. Минск, ул. Ташкентская, 7 | г. Минск, ул. Московская, 20 |
| Начальная цена предмета конкурса, руб. | | 1 162 796 693 | 1 196 734 676 | 27 232 021 | 64 711 877 |
| Размер задатка (рублей), порядок и сроки его перечисления | | 116 279 669 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в конкурсе, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества | 119 673 468 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в конкурсе, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества | 2 723 200 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в конкурсе, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества | 6 471 200 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в конкурсе, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества |
| Сведения об объектах недвижимого имущества, входящих в состав объектов приватизации | | здание специализированное для бытового обслуживания населения (прачечная) с инвентарным номером 500/С – 28281, в том числе составные части и принадлежности: проезд – 507 м², крыльцо – 314,5 м², бордюр – 8,3 м², тротуар – 41,3 м², стена декоративная – 36 м²; здание специализированное энергетики с инвентарным номером 500/С – 28143 | здание специализированное для бытового обслуживания населения (прачечная) с инвентарным номером 500/С – 30793; здание специализированное коммунального хозяйства (котельная) с инвентарным номером 500/С – 30792 | — | — |
| Условия конкурса | | 1. организация физкультурно-оздоровительного комплекса; 2. сохранение числа рабочих мест сроком на 2 года (с продлением трудовых отношений с работниками структурного подразделения); 3. погашение новым собственником кредиторской задолженности на момент подписания акта приема-передачи | 1. частичное сохранение профиля объекта приватизации; 2. сохранение числа рабочих мест сроком на 2 года (с продлением трудовых отношений с работниками структурного подразделения); 3. погашение новым собственником кредиторской задолженности на момент подписания акта приема-передачи | 1. частичное сохранение профиля объекта приватизации; 2. сохранение числа рабочих мест сроком на 2 года (с продлением трудовых отношений с работниками структурного подразделения); 3. погашение новым собственником кредиторской задолженности на момент подписания акта приема-передачи | 1. частичное сохранение профиля объекта приватизации; 2. сохранение числа рабочих мест сроком на 2 года (с продлением трудовых отношений с работниками структурного подразделения); 3. погашение новым собственником кредиторской задолженности на момент подписания акта приема-передачи |
| Приоритетное условие для определения победителя конкурса | | наивысшая цена предмета конкурса | наивысшая цена предмета конкурса | наивысшая цена предмета конкурса | наивысшая цена предмета конкурса |
| Условия оплаты | | оплата за объект приватизации производится в бюджет г. Минска в рассрочку* | оплата за объект приватизации производится в бюджет г. Минска в рассрочку* | оплата за объект приватизации производится единовременным платежом в течение 30 календарных дней от даты подписания договора купли-продажи в бюджет г. Минска | оплата за объект приватизации производится единовременным платежом в течение 30 календарных дней от даты подписания договора купли-продажи в бюджет г. Минска |
| Численность работающих, человек | | 13 | 10 | 4 | 4 |
| Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий | | нет | нет | нет | нет |
| Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов | | нет | нет | нет | нет |
| Финансовое состояние структурного подразделения | Активы по балансу, рублей | 1 171 217 312 | 1 209 092 814 | 30 117 896 | 70 660 980 |
| | Задолженность кредиторская, рублей | 8 420 619 | 12 358 138 | 2 885 875 | 5 949 103 |

* - порядок оплаты за объект приватизации в рассрочку установлен Инструкцией о порядке индексации платежей при продаже объектов приватизации в рассрочку, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 05.09.2006 № 36.

Порядок проведения конкурса определен Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Минского городского Совета депутатов от 23 сентября 2009 г. № 250.

Продавец (организатор конкурса) вправе отказаться от проведения конкурса в любое время, но не позднее чем за 30 дней до наступления даты его проведения.

**Заявления на участие в конкурсе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227 по рабочим дням с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 7 сентября 2010 года.**

Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения конкурса.

При поступлении заявления на участие в конкурсе от одного участника и соответствии его предложения условиям конкурса продажа предмета конкурса по решению комиссии производится этому лицу на предложенных им условиях.

Победитель конкурса в сроки, указанные в протоколе о результатах конкурса, обязан возместить организатору конкурса затраты, связанные с организацией и проведением конкурса, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом конкурса при заключительной регистрации под роспись.

Новым собственникам объектов приватизации (лоты №№ 3, 4) гарантируется право на заключение долгосрочного договора аренды занимаемых структурными подразделениями помещений, относящихся к коммунальной собственности г. Минска и не вошедших в состав приобретаемого имущества, сроком на 15 лет.

Осмотр предмета конкурса на местности участниками конкурса производится представителем Управления бытового обслуживания населения Мингорисполкома, конт. тел. (8017) 227 21 60, коммунального унитарного предприятия «Бытэкс», конт. тел. (8017) 203 25 65, коммунального унитарного предприятия «Чайка», конт. тел. (8017) 281 12 58.

Хто каго?

# «ЗМІРЫСЯ, ХЛОПЧА, ЗНІМІ ЁЙ ЗОРКУ...»



*Што было, было — чыстая праўда, між іншым (там, у Аўцюках, бывае і чыстая брахня)...*

*То прастуе, значыцца, адна кабета (досыць сталага веку) на свята, на фестываль народнага гумару. Ужо дайшла, лічы — мытня спыніла: для ўваходу трэба, маўляў, ці расказаць штось вясёлае, ці грошы заплаціць.*

*Кабета ім: сынкі, анічога такога ў маім жыцці не было — бацькі ў вайну загінулі, нас, сірот, пакінулі, свету белага не бачыла — малых братоў у людзі выводзіла...*

*— Ну тады выбачайце, — уздыхаюць мытнікі, — але парадак ёсць парадак: грошы плаціце.*

*Лёгка сказаць ім «плаціце», а вось як бабулі тое зрабіць, калі грошай у кашальку вобмаль, і тых на іншае трэба?!*

*Адышлася яна ўбок, падумала — назад вяртаецца. Кажа: сынкі, я ўспомніла, быў у мяне выпадачак. Можа, ён вам смешным падасца? У маладосці, значыць, заляцаўся да мяне хлапец — на танцы запрашаў, дадому падводзіў. Дык во ідзём з ім неяк, «гамонім». Я яму: «Васілёк, паглядзі, якое неба высокае, якія аблокі на ім...». Ён мне: «Ну...». «Васілёк, глянь, якое поле шырокае, які лес...». Ён мне яшчэ раз: «Ну...». «А возера якое, бачыш?.. І лебедзі... Паглядзі, Васілёк, як уецца вунь той ля сваёй галубачкі... Ты вось гэтак змог бы? Каля мяне...». «Не, — кажа Васілёк. — Што я дурны? У халоднай вадзе буду с. мачыць?».*

*Мытнікі аж ляглі тут, аж пакаціліся ад рогату! А бабуля, трохі счакаўшы (ну, пакуль супакояцца), «рысу падвяла», сказала: «У нашым, жаночым жыцці, яно ці не заўсёды так: як зоркі ў небе лічыць, дык яшчэ ёсць з кім, а як гаспадарку пыніць ды дзяцей гадаваць — няма дурных, с. мачыць нікому не хочацца».*

Смешная гісторыя? Ці ўсё ж такі сумная?

Ды хіба разбярэш? Акурат як з подпісамі да чарговага конкурснага здымка. Паглядзелі на яго чытачы і, як заўсёды, чаго толькі не ўбачылі! Ну найперш відавочнае: кіньце вочкам на здымак (уверсе) і разам з Любоўю Міхайлаўнай Чыгрынавай з Вілейшчыны прызнайце:

*Ёсць, было (хоць не пішы) —*
*З мілым рай і ў шалашы.*
*Тут жа бачым, як на яве:*
*З мілым рай — на голай лаве!*

Пра тое ж (толькі іншымі словамі) спадар Гарачоў з вёскі Даўнары, што на Іўеўшчыне:

*Як жа лёгка сёння Клаўцы!*
*Рвецца сэрцайка ў вышынь:*
*З любым добра і на лаўцы,*
*З любым рай і ў шалашы!*

Але ж трапіўшы ў яго, як раяць бывалыя (на гэты раз парад у пошце надзвычай шмат), розум губляць не варта. Асабліва дзяўчатам. Гэта вось (са здымка), па меркаванні сужэнцаў Астроўскіх з Мінска, абачлівая, «цвярозая». Таму і гаворыць зараз каханаму:

*— Паглядзі, мой свет, на неба,*
*Там на небе, Божы рай...*
*А чапаць мяне*
*не трэба,*
*Да вяселля пачакай.*

Прыкладна тыя ж словы з вуснаў дзяўчыны «зняла» і спадарыня Кусянкова з в. Лучын Рагачоўскага раёна:

*Бачыш бусліка*
*з малечай?*
*То не гладзь мяне*
*па нечым.*
*Так не доўга да бяды...*
*Вось ажэнішся — тады.*

Калі... ажэнішся. Бо дзеўка, па меркаванні спадара Дубовіка з Бярэзіншчыны, з форсам, з прэтэнзіямі. На што канкрэтна? Ды як многія цяпер:

*Не пляці, мой дружа, сетак*
*І не лезь абы куды,*
*Пакажы сваю барсетку —*
*Можа й злюбімся тады?*

Мае дзеўка рацыю, ой мае! Бо яно ж, змесціва той самай барсеткі (гэта сумачка такая... На здымку злева), ну, згадзіцеся, можа расказаць пра хлопца, пра мужчыну не менш, чым вясковае радыё, бо ў ёй зазвычай ляжаць ключы ад кватэры і машыны (калі яны, зразумела ж, ёсць), правы, службовае пасведчанне, пашпарт (дзе, можа, парачка дзетак упісана)... Трэба ж паглядзець? А то, баюць, ля аднаго са сталічных ЗАГСаў купка малых тусавалася. Ад няма чаго рабіць (ведама, горад, канікулы) рашылі маладых папалохаць. Тыя (чарговыя) толькі пад'ехалі (а ўжо прыгожыя, прыбраныя) — стаяць ля ўвахода, хвалююцца, адзін за аднаго трымаюцца... Трое смаркачыкаў да іх. Рукі жаніху падаюць, крычаць: «Віншуем, татачка! Класны выбар! Ну без балды... Нам падабаецца!». Нявеста, пачуўшы гэткі камплімент, вобзем... Яе маці — таксама...

Зрэшты, мы адхіліліся — ад барсеткі. У ёй, як вядома, яшчэ і грошы ляжаць.

Альбо не... (ляжаць). Бо што пакладзеш, як няма? Па меркаванні спадара Нефідовіча з Лунінеччыны, дзяўчына (са здымка) свайму кавалеру шэпча цяпер:

*Глядзі — у небе самалёт,*
*Ён за мяжу трымае лёт...*
*Распішамся, і ты мяне*
*Пашлі ў замежнае турнэ?!*
*...Маўчыць Іван,*
*трымціць душа,*
*Бо ў барсетцы ні шыша.*

Крыўдна — за Івана. Бо ён, відаць, хлопец ніштаваты і абавязкова — без розных там просьбаў — паслаў бы каханую ў далёкае вясельнае падарожжа. І сам бы махнуў. Каб мог...

Не можа... У тым ліку і адказаць ёй так, як прапануе спадарыня Чыгрынава. Па яе меркаванні здымак зроблены ў тыя імгненні, калі на лаўцы гучала дзявочае:

*— Эх, у Сочы б...*
*На тры ночы...*
*Паляцець у цёплы*
*Крым!..*

*У адказ жа:*
*— Многа хочаш,*
*Лепш на лаўцы*
*паляжым.*

Але ж, як лічыць спадар Лабко са Слонімшчыны, ляжаць яны не проста, а бавяць час за размовамі, за абменам... Чым? Сваімі назіраннямі, думкамі, досведам...

*— Каб з сягоння, Ваня,*
*ведаў, —*
*Цягне дзеўка ручку ў неба, —*
*Вунь — туманнасць*
*Андрамеды.*
*...Ваню ж зоркі*
*без патрэбы,*
*У яго — «мысля»*
*другая:*
*З ёй дзяўчо*
*і падграбае.*

Ды яшчэ і шкадуе. Аб чым? Падстаў шмат. Пра адну — спроба хайку ад Мікалая Мычко з Ельска (але перш, калі ласка, яшчэ раз кіньце вочкам на здымак):

*Яна паказвае зоркі,*
*Што з неба ім свецяць.*
*Ён — пазірае.*
*І з тугою думае:*
*Рука караткаватая...*

Тут вось што дзіўна: людзей — двое, глядзяць яны ў адну і тую ж кропачку, а думаюць...

Чаму так па-рознаму? Здагадка ад спадара Гарачова:

*Калі вельмі тут добра*
*разгледзецца,*
*Да лагічнага выйсці канца,*
*То дзяўчына —*
*з Вялікай Мядзведзіцы,*
*Ну а хлопец дык яўна*
*з Цяльца.*

А яны, цяльцы, вось такія. Дзяўчына паказвае (як лічыць спадарыня Дмухоўская з Нясвіжчыны):

*— Пабач, у небе аблачыны,*
*У іх — кружляе горды птах!*
*Яму ж мілей...*
*сцягно дзяўчыны:*
*Бо тое ж... воблака —*
*у джынса́.*

Падобныя яны — навобмацак, ці не, трэба спытаць у мужчын, што былі на сёмым небе, на тых аблоках. Ці хоць бы дакраналіся.

Да чаго? Ёсць пытанне, бо спадарыня Кузьменка з Мінска, паглядзеўшы на здымак, пачула наступны дыялог:

*— Коля, бачыш — аблачынка?*
*Вунь, у небе!*
*— Што ты, Нінка,*
*Аблачынка пада мной —*
*Дакранаюся рукой!..*

Не кожнаму, згадзіцеся, пашчасціць так — дацягнуцца... Да нябёсаў. Многія, як лічыць спадарыня Кусянкова з Рагачоўшчыны, пра падобнае толькі мараць:

*Ты б абняў Наталію*
*Моцна... Ніжэй таліі...*
*Толькі ёй пачуцці трэба,*
*Каб былі вышэй за неба.*

А калі трэба, то чаму ж ім не быць?!

*Змірыся хлопча,*
*Дастань ёй зорку!..*
*Жаданні з часам будуць цяжэй:*
*Праз год захоча на выхад норку,*
*Машыну, дачу,*
*Як у людзей.*
*Згаджайся, браце, як лепей раю:*
*Дастаці зорку, — бяда малая!*

Піша так спадар Гаўрыш з Пастаўшчыны, які, трэба разумець, даставаў? І не апёкся?!

У адрозненне ад спадара Нефідовіча, які са скрухай заўважае:

*Учора каля ног ляжала*
*І гэтак ласкава шаптала:*
*Дастань вунь тую зорку з неба*
*І мне ніч-чога больш не трэба!..*
*Дастаў... Цяпер сядзіць на карку*
*І патрабуе іншамарку,*
*У тры паверхі асабняк*
*І шмат-шмат грошай на дурняк.*

Чаму? Адказ на гэтае пытанне ведае спадар Старых з Гомеля:

*Калі дзеўка маладая,*
*То ў аблоках шчэ лунае.*
*Ёй тады чамусьці трэба,*
*Жураўля ці зорак з неба.*
*А як стане маладзіцай*
*Неўзабаве прызямліцца:*
*Будзе думаць і гадаць,*
*Як сініцу ўтрымаць.*

Зноў жа парады бывалых і ў прыватнасці спадарыні Пажога з Глыбоччыны, якая ад імя дзяўчыны піша:

*Безліч зорак*
*на небе ночы*
*Ну а сонца —*
*адно-адзінае...*
*Буду сонейкам*
*зваць цябе,*
*хочаш?*
*Калі стану тваёй*
*палавінаю.*



Абмен, значыцца? Ты мне, я — табе. А так прыгожа ўсё пачыналася:

*Праект*
*паветранага замка*
*Чарціла*
*дзеўчыны рука*
*Пад пільным*
*позіркам каханка*
*І... Анатоля*
*Клешчука.*

Ён, як вы бачыце, чытаючы газету, па-ранейшаму, як той Фігара, гойсае па краіне, па-ранейшаму здымае. У тым ліку і для любімага ім і чытачамі конкурсу «Хто каго?».

То нагадаем, што на папярэднім яго этапе (на здымку, пазаганяўшы людзей на плот, па вуліцы (дакладней — па вялізнай лужыне) «плыў» аўтамабіль) вылучыліся спадары Сільчанка з Гомеля, Гарачоў з Іўеўшчыны, Нефідовіч з Лунінеччыны, Гарбачоў з Сянно, Федарака са Скідаля, спадарыні Пажога з Глыбоччыны і **Васільева** з Гомеля. З гэтым, апошнім меркаваннем вялікага чытацкага журы, не магло не пагадзіцца і журы рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» накіроўваецца ў Гомель. Хочаце, каб да вас, — пішыце. Можна, дарэчы, і штось нечаканае. Як вам, напрыклад (пра салодкую парачку з лаўкі):

*Не паехалі на Вячу*
*Дзеўчына з мужчынам:*
*На халеру тая дача*
*Гэтым гультаінам?! —*

асуджае маладых Юрый Вінаградаў з Бабруйска. Бо яно ж на лаўцы ляжаць — не агуркі на зімачку ставіць...

Не менш нечаканымі падаліся і радкі спадара Гарачова:

*Як зямля тых дзевак носіць?*
*Нас жа ў зман яны вядуць:*
*Толькі зорак з неба просяць,*
*А вось замуж не ідуць.*

Яно, згадзіцеся, больш заканамерна было б спытаць: як зямля тых хлопцаў носіць... (што так многа ў дзевак просяць, а вось замуж не бяруць)? Але ж, як патрабуе рубрыка, аб сумным не будзем, будзем («з падачы» тога ж аўтара):

*Не аб каханні, а аб маралі —*
*У рыфму словы —*
*гатоў «санет»:*
*Карл у Клары не краў*
*каралы, —*
*Ён яе моцна трымаў*
*за «кларнет».*

І не проста так, а (як піша спадарыня Янучок з вёскі Нагорнае Клецкага раёна) у чаканні, бо на здымку

*Сітуацыя такая:*
*Двое ў неба паглядаюць*
*І чакаюць ад нябёс,*
*Лепшай долі, лепшы лёс...*

Мо памыляюся, але ж, калі б адтуль чакалі дажджу, то рана ці позна прыждалі б, а вось «лепшай долі», па-мойму, не вылежыш. Рабіць нешта трэба... А ўжо ў перапынках —

*Мы таксама калі-нікалі*
*Задуменна зірнём у нябёсы...*
*Доўгі час незайздросна жылі,*
*Вось бы ў шчасці пажыць давялося!*

Мараць так сужэнцы Астроўскія з Мінска. Мы, як кажуць, падпісваемся пад гэтымі словамі і чакаем новых прапаноў. Да новага здымка.

Умовы ранейшыя — не больш за 8 радкоў: дасціпных, разборлівых, па-беларуску. Бо «Двое радышкам сядзяць, аб каханні гавараць...» гучыць смешна, але ж толькі на першы погляд. На другі...

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота (яно ж новае конкурснае заданне) Анатоля КЛЕШЧУКА.**

**P.S.** *Калі матэрыял быў падрыхтаваны да друку, пошта прынесла яшчэ адзін «дыялог з лаўкі» (ад Алы Тарасік з Мінска)*

*— Падарыць табе*
*тую зорку*
*І развеяць неяк нуду?..*
*Але што з тае зоркі толку?*
*Лепей выпішам*
*мы «Звязду».*

*Гэта — добры намер. Як і жаданне выйграць падпіску ў нашым конкурсе. То пішыце.*

Гучная справа

# ЗАБОЙЦУ БЕЛАРУСКАЙ КАЦІ ЎРАТАВАЎ ДАРАГІ ГАЛАНДСКІ АДВАКАТ?

**26-гадовую грамадзянку Беларусі Кацярыну Брокель знайшлі забітай ва ўласным доме ў Нідэрландах. Муж Ян-Роберт кінуўся наўцёкі ў ЗША, прыхапіў з сабой дачку Ніколь.**

**Ян-Роберт быў адзіным падазроным у жахлівым забойстве Каці. Здавалася б, галандскаму мужу не выкруціцца ад пажыццёвага зняволення. Але той наняў дарагога адваката і... быў вызвалены з турмы. А пазней вытворчасць па справе была прыпынена.**

**Пра несправядлівыя падрабязнасці крымінальнай гісторыі даведаўся карэспандэнт «Звязды» Яўген ВАЛОШЫН.**



Вясельны фотаздымак Каці і Роберта Брокеля.

Пра страшнае забойства беларускі Кацярыны Брокель (жаночае прозвішча Ханяк) яшчэ у 2008 годзе расказалі нідэрландскія і бельгійскія сродкі масавай інфармацыі. Труп некалі сімпатычнай дзяўчыны знайшлі ў доме мястэчка Баарле-Насаў, дзе яна жыла з мужам Робертам і маленькай дачкой Ніколь.

Больш за паўгода галандскі муж не звяртаўся ў паліцыю, быццам нічога не здарылася. Беларускія сваякі Кацярыны, збянтэжаныя яе адсутнасцю, звярнуліся ў нашу міліцыю. У Нідэрланды быў накіраваны адпаведны запыт — беларуску пачалі шукаць.

Знаходка аказалася страшнай. Рэшткі цела, залітыя мантажнай пенай, знайшлі ў шафе.

У 2008 годзе сваё журналісцкае расследаванне правяла мая калега, галандская журналістка Ёланда Шоўкерс з выдання BN DE Stem. Ёй удалося паразмаўляць са следчымі і сведкамі па крымінальнай справе.

*«Бландзінка Катрына з Беларусі пабралася шлюбам з Робертам-Янам Брокелем у чэрвені 2003 года. Вяселле адгулялі з размахам,* — пісала Ёланда Шоўкерс. — *Роберт-Ян працуе ў сферы сэкс-індустрыі, кіруе сеткай бардэляў...»*

Таксама журналістка Ёланда Шоўкерс даведалася пра апошнія смс-паведамленні, якія высылаліся з тэлефона Каці. Іх атрымлівала Сюзен, галандская сяброўка нашай дзяўчыны.

Напрыклад, за некалькі дзён да смерці Каця пісала: «Муж хоча мяне забіць». На наступны дзень — «Я адлятаю ў Беларусь». А праз некалькі гадзін пасля гэтага прыйшла яшчэ адна загадкавая эсэмэска: «Я прыляцела ў Мінск, усё нармальна». Сюзен зрабіла для журналістаў сваю выснову: «Напэўна, забойца сам напісаў дзве апошнія эсэмэскі, каб заблытаць сляды».

Галандскае выданне выказала сваю версію разладу ў сям'і Брокеляў. Маўляў, да Каці з Беларусі прыехаў палюбоўнік Уладзімір, якога яна выдавала за брата. Муж згубіў маральны кантроль, калі даведаўся праўду.

Нідэрландская паліцыя распачала следства. Тым часам Роберт-Ян Брокель сам прыляцеў на радзіму і быў 27 лютага 2008 года затрыманы і змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання.

## «МУЖ МЯНЯЎ ЁЙ МАШЫНЫ, НЕ ШКАДАВАЎ ГРОШАЙ, АЛЕ БЫЎ СЭКСУАЛЬНА ЗАКЛАПОЧАНЫ»

Як толькі ў газеце BN DE Stem з'явіўся матэрыял пра акалічнасці крымінальнай справы, я накіраваўся да беларускіх сваякоў Каці. На гутарку пагадзілася малодшая сястра забітай дзяўчыны — Надзя Ханяк, жыхарка Мінска. Яна расказала, чаму сястра пабралася шлюбам з Робертам-Янам і з-за чаго пачаўся разлад у сям'і.

— Калі Каця ўпершыню паехала ў Галандыю і пасля вярнулася, Роберт тэлефанаваў амаль кожны дзень, упрошваў сястру выйсці за яго замуж, — распавядала Надзя Ханяк. — Праз некалькі месяцаў Каця з'ехала. А яшчэ праз паўгода было вяселле, сястра зацяжарала. Потым нарадзілася пляменніца Ніколь, сястра кожны дзень тэлефанавала, ні на што не жалілася.

**— Пра такі шлюб з забяспечаным замежнікам мараць многія беларускія жанчыны. Як жылося вашай сястры?**

— Добра. Праўда, працаваць ён Каці не дазваляў, раўнаваў. Жылі заможна. Сястра распавядала: «Здараецца, перад мыццём вытрушваю кішэні яго штаноў, дык высыпаюцца тысячы еўра. І грашыма гэтымі муж нават не цікавіцца». Каця здала на правы, муж тут жа набыў машыну за 18 тысяч еўра. Урэзалася ў дрэва — трымай новы аўтамабіль. Праўда, не раз пераязджалі з горада ў горад, уцякалі ад падатковай паліцыі...

**— Калі Роберт запраўляе бардэлямі, мо ён і сам заклапочаны ў сэксуальным плане?**

— Ён рос адзіным дзіцем у сям'і. У школе з ім ніхто не сябраваў. Меў шмат комплексаў. Ён страшэнна любіў кампліменты. Калі надзяваў новую вопратку, хацеў, каб усе вакол казалі: «Як яна табе пасуе!». Калі яго не заўважалі, крыўдзіўся, мог утаперыцца ў камп'ютар і сядзець паўдня з сумным выглядам. Ён быў заклапочаны на сэксуальнай глебе, сястра яму казала: «Калі нешта не задавальняе, знайдзі сабе палюбоўніцу». Ён пачаў здраджваць.

**— А як зразумець інфармацыю з галандскай прэсы наконт Уладзіміра, беларускага палюбоўніка Каці, які жыў у іх доме пад выглядам брата?**

— Сапраўднае імя гэтага хлопца — Максім. З Кацяй яны пазнаёміліся ў Мінску, калі яна прыязджала ўладкоўваць пытанні з пашпартам. Тады яна ўжо разумела, што хоча разысціся з мужам. А першыя небяспечныя званочкі былі. Аднойчы Роберт прывёў яе ў так званы пара-клуб, дзе сямейныя пары абменьваюцца сэксуальнымі партнёрамі. Там ужо чакалі прыяцель мужа і яго сяброўка. Каця наадрэз адмовілася ад такога інтымнага кантакту. Муж пачаў лютаваць, ледзь яе не задушыў. Сястра перапужалася, але назаўтра Роберт прынёс вялізны букет кветак, стаў на калені. Ужо тады Каця падумвала забраць дачку і пераехаць жыць у Мінск.

## МАЛЕНЬКАЙ НІКОЛЬ СКАЗАЛІ: «МАМА ЦЯБЕ КІНУЛА, З'ЕХАЛА Ў БЕЛАРУСЬ»

Праз некалькі тыдняў пасля гэтага інтэрв'ю Надзя Ханяк паляцела ў Баарле-Насаў, дзе яе дапытвалі як сведку па справе аб гібелі сястры. Я таксама меўся выправіцца ў Нідэрланды, але ў апошні момант не склалася з шэнгенскай візай. Пра допыты ў паліцыі і наведванне таго самага дома, дзе знайшлі труп Каці, мне па тэлефоне распавядала сама Надзя і калегі з расійскага тэлебачання. Ужо тады стала зразумела — Роберт-Ян Брокель можа пазбегнуць пакарання. І вось чаму. Сюзэн, сяброўка загінулай Каці, якая ахвотна давала інтэрв'ю журналістам і была ўпэўнена ў вінаватасці Роберта, раптам змоўкла, нібы напужалася, перастала ісці на кантакт. Роберт наняў вельмі дарагога і кваліфікаванага адваката.

*— Кажуць, што гэта адзін з самых дарагіх адвакатаў у Галандыі,* — хвалявалася ў тэлефоннай размове Надзея Ханяк. — І *хоць у паліцыі сцвярджаюць, што ўсе факты не на карысць Роберта, я баюся, што ён можа пазбегнуць пакарання.*

Следства таксама праводзілася дзіўна. З аднаго боку, журналісты сцвярджалі, што ўдзел у мерапрыемствах па выкрыцці Роберта бяруць нямецкія і нават амерыканскія эксперты. З іншага боку, дом, дзе жыла маладая сям'я Брокеляў, нават не быў апячатаны.

*— Чырвоная стужка з надпісам STOP там нібыта нацягнута, але дзверы прыадчыненыя, нічога не апячатана. Хоць дом — гэта важны рэчавы доказ,* — перадавалі мне з месца падзей расійскія тэлевізійнікі.

Сястру Надзю Ханяк дапыталі і адправілі дадому, паабяцалі ў хуткім часе выйсці на сувязь. Але ні паліцыя, ні журналісты на сувязь больш не выходзілі.

Ужо праз некалькі тыдняў «дарагі» адвакат Роберта-Яна Брокеля дамогся першых вынікаў для свайго забяспечанага кліента.

*«Паколькі следству не ўдалося высветліць прычыны смерці Катрыны, было прынята рашэнне вызваліць 37-гадовага падазронага, які не прызнае сваёй віны. Брокель не абмежаваны ў перамяшчэнні, яму дазволена разам з дачкой пакідаць межы краіны»,* — перадало выданне BN DE Stem.

А праз нейкі час была прыпынена і вытворчасць па крымінальнай справе.

*— Мне так і перадалі: «Віну Роберта не даказалі. Ён застаўся на волі». Атрымліваецца, што ён жыве спакойна і не мае ніякіх праблем, — абураецца Надзя Ханяк. — А за страшнае забойства сястры пакарання ніхто не панёс. Таксама мне перадалі, што Ніколь жыве разам з ім. Маленькай пляменніцы сказалі: «Маці кінула цябе і з'ехала ў Беларусь...»*

Толькі ў 2010 годзе Надзеі Ханяк даслалі даведку аб смерці сястры, на галандскай мове. Гэта папера і сямейныя фотаздымкі Каці — адзіны ўспамін пра сястру, якая так недарэчна і так страшна загінула ў замежным «раі».

**Яўген ВАЛОШЫН.**

**ПОГЛЯД ЗБОКУ**

Трагічная гісторыя, якая здарылася з прывабнай беларускай дзяўчынай Кацяй, раскрывае цяжкія заганы сучаснага грамадства — за грошы часам можна ўсё. І не важна, дзе ты знаходзішся, у Нідэрландах ці нейкай збяднелай краіне, дзе не сціхаюць войны. Плаці грошы — і нават страшнае забойства, пра якое ведае паўсвету, можна прыкрыць.

Апошнім часам я шмат пішу пра хібы праваахоўнай сістэмы ў Беларусі. Такая праца журналіста — у нейкай ступені кантраляваць кампетэнтныя дзяржаўныя органы. Некаторыя службовыя асобы крыўдзяцца на такія матэрыялы, а некаторыя асабліва ўражлівыя чытачы пачынаюць думаць: «Як у нас усё дрэнна, прама бяспраўе!»

Але аказваецца, што замежныя праваахоўнікі могуць адмачыць такі нумар, што валасы дуба становяцца. Асабліва калі ахвяра — беларуская дзяўчына, сваякі якой не могуць наняць «дарагога» адваката.

Хто ж, калі не Роберт Брокель, вінаваты ў забойстве Каці Ханяк?

Рэшткі цела, залітыя мантажнай пенай, знаходзяць у пакоі дачкі Ніколь. Муж незадоўга да гэтага пагражаў смерцю. Каця знікае — і муж уцякае з дому, кідаецца наўцёкі ў ЗША.

Можа быць, «дарагі» адвакат падказаў паліцыі новыя неверагодныя факты, якія сведчаць пра тое, што беларускую дзяўчыну забіў не яе муж-вычварэнец, а нехта іншы? Але гэта ўжо — сцэнар для фантастычнага дэтэктыву... Разгадка тут простая — калі ты госць у чужой краіне, то і законы для цябе іншыя, то і пра справядлівасць можаш забыцца.

Многія нашы дзяўчаты мараць пра замежныя раі, але сутыкаюцца з праблемамі.

Каця зразумела, што грошы, добрыя машыны, прасторны дом — гэта не самыя прыярытэтныя рэчы ў жыцці. А менавіта на такія даброты часта клююць беларускі і дажываюць рэшту свайго жыцця нешчаслівымі. Каця зразумела, што з «замежнага раю» трэба вырывацца, але не паспела...

Футбол

# Да пабачэння, Ліга чэмпіёнаў. Чакаем Лігу Еўропы

**Дацкі «Капенгаген» спыніў шэсце БАТЭ ў плэй-оф Лігі чэмпіёнаў. І цяпер другі год запар беларускі клуб пастараецца трапіць у фінал другога па значнасці еўракубка — Лігу Еўропы. Праўда, адназначна сказаць, што чэмпіён Даніі больш варты фіналу Лігі чэмпіёнаў, ніяк нельга — з такімі дзіцячымі памылкамі пераможцам гэтага матчу мог быць любы супернік. Але такая выснова прыйшла пасля матчу.**

Надзеі беларускіх балельшчыкаў на стыкавыя гульні Лігі чэмпіёнаў былі ўтаптаныя ў газон на 59-й хвіліне — Н'Дойе перайграў Юрэвіча, а затым і Верамко — 3:2. Але што дзіўна — калі два гады таму выхад у фінал Лігі чэмпіёнаў быў для ўсяго беларускага футбола фантастыкай і сенсацыяй, то цяпер пройгрыш нават больш масцітаму суперніку ўсе ўспрымаюць як няўдачу. І сапраўды ж маглі...

Пасля Віктар Ганчарэнка наракаў: «Мы марудна ўкатваемся ў гульню. І цяпер не загулялі да той пары, пакуль не атрымалі па галаве. Двойчы. Асаблівасці менталітэту нацыі накладваюць адбітак і на гульні». У складзе «Капенгагена» трэнер вызначыў Н'Дойе: «Гэты цемнаскуры футбаліст — светлая пляма датчан. Мы адзначылі яго яшчэ пасля першага прагляду відэаматэрыялаў. І зараз, на жаль, не здолелі з ім справіцца». У цэлым Віктар Ганчарэнка застаўся задаволеным сваёй камандай: «Мяркую, гледачам гульня спадабалася. БАТЭ і «Капенгаген» разыгралі сапраўдны трылер. У першай трэці мы прапусцілі два галы, але не зламаліся і здолелі адыграцца. На другі тайм выходзілі з надзеяй трапіць у наступны раўнд. Калі адкінуць негатыўныя эмоцыі, лічу, што мы правялі вельмі добры матч».

Вось як пра беларускую каманду мяркуе трэнер суперніка: «Мы гулялі супраць вельмі моцнага клуба, які за апошнія два гады лічаную колькасць разоў не здолеў забіць у гасцях. На гэтым адрэзку беларусы толькі двойчы вярталіся з выездаў з паражэннямі. Гэта былі матчы супраць «Рэала» і «Бенфікі». Гэта пра штосьці гаворыць! Каманда ўмее забіваць галы любому апаненту. Цяпер зразумела, чаму мы абралі такую асцярожную тактыку ў Барысаве і Капенгагене. Калі б мы гулялі па-іншаму, беларусы б нас проста «забілі».

Сёння адбудзецца жараб'ёўка, пасля чаго БАТЭ даведаецца свайго суперніка за фінал Лігі Еўропы.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# ЛЮСТЭРКА

**Люстэрка як сімвал адлюстравання і падваення рэчаіснасці ў народнай культуры атрымала статус «мяжы» паміж зямным і «іншым» светам, светам духаў. Здольнасць адлюстроўваць навакольны свет надала гэтай рэчы шмат цікавых якасцяў. Нашы продкі лічылі, што ў люстэрку можна ўбачыць мінулыя, цяперашнія і будучыя падзеі, надзялялі яго звышнатуральнай сілай. Тым самым падкрэслівалася асаблівая значнасць гэтай рэчы.**

- Разбітае, трэснутае люстэрка ў хаце (г.зн. парушэнне гэтай нябачнай «мяжы») заўсёды выклікала трывогу і лічылася прадказальнікам бяды.
- Калі ў хаце паміраў чалавек, неабходна было завесіць ці перавярнуць люстэрка да сцяны. У момант прыходу «смерці» ў хату мы не павінны ўбачыць гэту «мяжу» адкрытай.
- Акрамя гэтага, лічылася, што смерць «падвоіцца ў люстэрку», г.зн. забярэ яшчэ кагосьці.
- У некаторых рэгіёнах, каб захаваць сваю сям'ю ад новай смерці, пасля пахавання да люстэрка першай падносілі кошку.
- Часам люстэрка завешвалі яшчэ да надыходу смерці — каб палегчыць адыход чалавека ў іншы свет.
- Люстэркі ў хаце заставаліся завешанымі да моманту вынасу цела і пахавання, часам — да 9 ці 40 дзён пасля смерці, радзей — на працягу ўсяго памінальнага года.
- Забаранялася глядзецца ў люстэрка ноччу, а таксама ў час навальніцы і ўдараў маланкі. Лічылася, што ў такія хвіліны можна ўбачыць сваю смерць, пастарэць раней часу, страціць сваю прыгажосць і здароўе, бачыць дрэнныя «цяжкія» сны: «глядзецца на ноч у люстэрка — наклікаць на сябе смерць».
- Тыя ж забароны на кантакт з люстэркам існавалі і ў момант нараджэння дзіцяці. Парадзісе, перад якой у гэты час быў «адчынены шлях у гэты свет», катэгарычна забаранялася глядзецца ў люстэрка.
- На працягу першага года жыцця дзіцяці забаранялася кантактаваць з люстэркам. Лічылася, што дзіця ўбачыць там сваю сталасць, згубіць спакой і сон, доўгі час не будзе размаўляць, будзе заікай, спужаецца, яго жыццё «перавернецца» і яно перастане расці і развівацца.
- Нягледзячы на ўсё вышэйпералічанае, здольнасць падвойвацца ўспрымалася ў народнай культуры як станоўчая якасць. Лічылася, што нячыстая сіла страчвае сваю магічную здольнасць шкодзіць чалавеку, калі адаб'ецца ў люстэрку. Таму разам з іншымі абярэгамі (напрыклад, асвячонай вярбой, крапівой, чацвярговай соллю, забітай сарокай і інш.) невялікае люстэрка як абярэг ад нячыстай сілы клалі ў калыску дзіцяці, насілі ў кішэні, вешалі ў хляве.
- Часам пасля вянчання маладым падносілі люстэрка, у якое яны павінны паглядзець разам — «каб жыць у пары».
- Менавіта люстэрка часцей за ўсё выкарыстоўвалі ў варожбах. Для гэтага неабходна было на Святкі з заходам сонца не ў хаце (напрыклад, у лазні) зірнуць у люстэрка, каб там убачыць суджанага. Часам для таго ж бралі два люстэркі, такім чынам ствараючы калідор паміж тым і гэтым светам.
- У народзе лічылася: «Калі разаб'еш люстэрка, цябе чакае сем няшчасцяў». Каб пазбегнуць непрыемнасцяў, народныя знахары раілі кінуць чацвярговую соль праз левае плячо, а люстэрка кінуць у раку.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

Усміхнемся!

Даішнік тармозіць матацыкліста:

— Не прышпілены, шкло таніраванае, пярэдні нумар адсутнічае, а фара гарыць толькі адна!

☺

**Лепшым месцам адпачынку ў ліпені 2010-га прызнаны халадзільнік.**

☺

— Я цешчу важу на дачу з задавальненнем. Яна мне грошы за бензін вяртае.

— І доўга будзе гэта «з задавальненнем» працягвацца?

— Пакуль яна будзе верыць, што мае «Жыгулі» жаруць 50 літраў на 100 кіламетраў...

☺

**Самая папулярная першая фраза ў любым паходзе: «А ведаеце, што мы забыліся?»**

☺

Дзве сяброўкі:

— Ну што, вяселле хутка?

— Баюся, што не вельмі. Мой жаніх — хлопец ну вельмі грунтоўны. Сказаў, што перш чым ажэнімся, ён абавязаны пазнаёміць мяне з усімі сваякамі. Учора вось у заапарк мяне вадзіў — знаёміць пачаў з самых далёкіх.




**«ФОНД «ГРОДНООБЛИМУЩЕСТВО»**
**16 августа 2010 года в 11 часов 30 минут**

**ПРОВОДИТ АУКЦИОН**

**с условиями по продаже объектов, находящихся в собственности Гродненской области, и права заключения договоров аренды земельных участков:**

**1.** комплекса зданий, сооружений УДП «Гродненский пивоваренный завод» в г. Гродно по ул. Замковой, 2 и права заключения договора аренды земельного участка площадью 0,8155 га. Начальная цена продажи предмета аукциона 6 880 168 467 рублей;

**2.** здания дома быта Кореличского КБО и права заключения договора аренды земельного участка площадью 0,0383 га, расположенного в г.п. Кореличи по ул. 1 Мая, 2. Начальная цена продажи предмета аукциона 307 047 917 рублей;

**3.** здания специализированного для бытового обслуживания населения Кореличского КБО и права заключения договора аренды земельного участка площадью 0,1733 га, расположенного в г.п. Мир по ул. Первомайской, 13. Начальная цена продажи предмета аукциона 83 258 908 рублей.

По вопросам участия в аукционе обращаться по **тел. 77 29 15, 72 25 18».**



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

**Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.**

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 3812. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# «МЫ БУДУЕМ ЖЫЛЛЁ»







## Так, з гонарам, гавораць у Новалукомскай ПМК-58

**Калі ў буйных будаўнічых арганізацыях краіны і аб'ёмы будаўніцтва, і планы будаўнікоў, і самі праекты нярэдка вызначаюцца сваёй маштабнасцю і размахам, то куды больш сціпла выглядае ўсё гэта ў будаўнікоў з перасовачных механізаваных калон або, як яшчэ іх часам называюць, — сельскіх будаўнікоў. Тым не менш, і адны, і другія робяць аднолькава важную справу, і асабліва цяпер, калі намаганні ўсіх будаўнічых арганізацый краіны ў першую чаргу скіраваныя на ўзвядзенне жылля. Па сутнасці, па тым, як тыя ці іншыя будаўнічыя арганізацыі працуюць на выкананне гэтай першачарговай для іх на сённяшні дзень задачы, мяркуюць і пра іх адпаведны ўклад у тую ж агульнабудаўнічую справу.**

НОВАЛУКОМСКУЮ перасовачную механізаваную калону № 58 (ПМК-58) да буйных будаўнічых арганізацый аднесці нельга: тут працуе каля 140 чалавек, аб'ёмы — адносна невялікія; асноўная задача калектыву — узвядзенне жылля на вёсцы, для сельскіх працаўнікоў, або, па сутнасці, узвядзенне простых індывідуальных тыпавых дамоў катэджнага тыпу. Як тут спраўляюцца з гэтай задачай, можна меркаваць па наступных фактах і лічбах: пачынаючы з 2006 года, працаўнікі ПМК-58 узвялі каля 200 такіх дамоў, заставілі імі цэлыя аграгарадкі (падчас наведвання Новалукомскай ПМК-58 мы пабывалі ў адным з такіх аграгарадкоў і можам засведчыць: гэта прыгожыя сучасныя дамы-катэджы, у цэлым добраўпарадкаваныя сядзібы); за энергарэсурсы тут, як адзначалі ў самой ПМК-58, разлічваюцца своечасова, заработную плату не затрымліваюць; апошнім часам павялічылі свой колькасны склад на 20 чалавек (гэта значыць стварылі новыя рабочыя месцы); выпрацоўка на аднаго работніка ПМК-58, у прыватнасці за мінулы год, складае больш за 42 мільёны рублёў, што ўвогуле лічыцца нядрэнным паказчыкам, у ПМК-58 выконваюць 30 працэнтаў будаўніча-мантажных работ у раёне. Ужо зразумела, спецыфіка работы мехкалоны звязана з раскіданасцю аб'ектаў па раёне, аддаленасць якіх ад асноўнай базы дасягае 40 кіламетраў — гэта, у сваю чаргу, выклікае дадатковыя выдаткі на транспарт, на тое, каб адвезці і прывезці людзей, што змяншае перавагі больш простага будаўніцтва на вёсцы... «Тым не менш, у буйныя аб'екты не ўвязваемся, пакуль што не хапае сіл», — так і сказаў падчас сустрэчы дырэктар ПМК-58 Мікалай Васюк, хоць, як будзе бачна ніжэй, у Новалукомскай ПМК робяць да гэтага пэўныя крокі. Аднак пра гэта ніжэй, а цяпер крыху пра гісторыю з'яўлення «нашай» будаўнічай арганізацыі. Варта адразу адзначыць: гісторыя на самым пачатку прапаноўвала калектыву тыя ж маштабнасць і будаўнічы размах. Цяперашняя ПМК-58 прызначалася для ўзвядзення магутнага завода па выпуску цэглы — да 150 мільёнаў штук за год. Нікто такой магутнасці на той час не меў, не мае і цяпер, хіба што Радашковіцкі керамічны завод ужо шмат гадоў падбіраецца да гэтай лічбы. Чаму было вырашана пабудаваць такі завод менавіта ў Новалукомлі? А рэч у тым, што якраз у гэтых мясцінах пачынаецца магутны пласт знакамітай па сваіх якасцях гліны, які і цягнецца на сотні кіламетраў ажно да тых жа Радашковічаў. Словам, меркавалася асвойваць гэты пласт адначасова з двух бакоў — з боку Радашковічаў і з боку Новалукомля. Тым больш на будаўніцтва новага завода, з дазволу сказаць, натхніла чарнобыльская бяда: яго цэгла прызначалася для будаўніцтва дамоў для перасяленцаў. Ды толькі многія добрыя мэты пахаваў развал Саюза, а разам з тым раптоўнае заканчэнне ўсякага фінансавання з саюзнага бюджэту. Тое, што можна было дэманціраваць на недабудаваным заводзе, — дэманціравалі, толькі 14 кіламетраў камунікацый засталося ляжаць у зямлі. А былы калектыў цяперашняй ПМК-58 разам з тамі цікавым заказам пазбавіўся і ўсялякай на той час перспектывы. «На самым пачатку вельмі гаравалі: не было заказаў, не было аб'ёмаў, у людзей — заработнай платы, даводзілася шукаць заказы па ўсёй вобласці і за яе межамі:




будавалі школу ў Талачынскім раёне, бальніцу — у Крупскім», — падкрэслівае кіраўнік ПМК-58 Мікалай Васюк, а ён некалі і прыбыў сюды самым першым, адзін — з загадам на руках аб стварэнні будаўнічай арганізацыі, якой і належала ўзвесці той жа завод па выпуску керамічнай цэглы. Такім чынам, завод не з'явіўся, а будаўнічая арганізацыя засталася. І, дарэчы, у ёй мяркуюць, што на ўзвядзенні завода яшчэ не пастаўлена канчатковая кропка. Пра добрую гліну адзначанага пласта добра ведаюць чэхі, якія ўжо выказвалі пэўную цікавасць да адпаведнага праекта, расіяне; гэтую гліну выкарыстоўвае ў сваёй вытворчасці Мінскі камбінат будаўнічых матэрыялаў, хоць, зразумела ўжо, і возіць яе здалёк; вазілі яе нават на Крычаўскі цэментны завод, дзе таксама выкарыстоўвалі непасрэдна ў вытворчасці цэменту.

* * *

Аднак вернемся да цяперашняй дзейнасці ПМК-58. І напачатку прывядзём запіс з заключэння камітэта па будаўніцтве Віцебскага аблвыканкама, якое датычыцца экспертызы бізнес-плана развіцця Новалукомскай ПМК-58 на 2010 год: «Вытворчыя магутнасці, якія маюцца, кваліфікаваныя кадры, пастаянны кантроль якасці будаўніча-мантажных работ прыцягваюць заказчыкаў (зразумела, прыцягваюць іх да паслуг ПМК-58), якія з'яўляюцца прадпрыемствамі розных формаў уласнасці».

Ужо адзначалася: невялікая па сваіх памерах Новалукомская ПМК-58, і на буйныя аб'екты тут не прэтэндуюць (пакуль што), тым не менш сваю долю на будаўнічым рынку закрываюць упэўнена. Таксама ўжо сказана і пра аграгарадкі ПМК-58, якія яна ўзвяла ў адносна кароткі тэрмін. Прычым гэта аб'екты, як падкрэсліваюць у мехкалоне, узведзеныя на ўсе 100 працэнтаў уласнымі сіламі або без прыцягнення дадатковых, субпадрадных, арганізацый. «Усё ў гэтых дамах і вакол іх (гаспадарчыя пабудовы, агароджы) наша, выканана ўласнымі сіламі, хіба што асфальт не «наш», — падкрэсліваюць у ПМК-58. У свой час прыходзілі пасля будаўнікоў з ПМК-58 сантэхнікі, электраманцёры і іншыя субпадрадчыкі, але цяпер тут зусім адмовіліся ад іх паслуг, справядліва ўзважыўшы, што так будзе больш выгадна (пры гэтым набылі адпаведныя ліцэнзіі).




Мехкалона мае сваю невялікую вытворчую базу, на якой вырабляе фундаментныя блокі, керамзітабетонныя перамычкі, кольцы для калодзежаў, пілуе для сваіх патрэбаў дошку, брус. Сваё — таксама больш выгаднае, прычым з цягам часу тут мяркуюць пашырыць свой цяперашні драўнінны асартымент — за кошт дошкі для падлогі, плінтуса, абналічкі.

Мы вышэй назвалі індывідуальныя дамы, якія ўзводзіць ПМК-58 для вёскі, даволі простымі збудаваннямі. Аднак, напэўна, так сказаць будзе не зусім правільна. Гэта сучасныя дамы, даволі прасторныя (да 100—120 квадратных метраў), у якіх, паводле выказвання спецыялістаў мехкалоны, ёсць усё, што трэба, якія таксама маюць высокія характарыстыкі па цеплаўтрыманні (гэтаму, у прыватнасці, садзейнічае ўзвядзенне шматслаістых сцен з выкарыстаннем сучасных матэрыялаў — уцяпляльнікаў).

Сёлета будаўнікі мехкалоны значна пашырылі сферу сваёй дзейнасці, вярнуўшыся пасля доўгага перапынку ў свой прыгожы горад Новалукомль. Дакладней кажучы, яны пачалі будаваць жыллё (шматкватэрныя дамы) і ў горадзе, у якім мясцовыя ўлады вырашылі закрыць добра вядомую многім нашых грамадзян чаргу. У мехкалоне адпаведнай кваліфікацыі, як падкрэсліваюць тут, не страцілі; пра гэта сведчыць і тое, што першы нядаўна ўзведзены калектывам шматкватэрны дом няблага ўпісаўся ў агульнагарадскі жыллёвы ансамбль.

Галоўны інжынер ПМК-58 Аляксандр Сакалоўскі пазнаёміў нас з будаўніцтвам другога шматкватэрнага дома (дарэчы, акрамя яго, калектывам закладваецца цяпер у горадзе яшчэ два шматкватэрныя дамы). Тут, з мэтай паскарэння тэрміну ўводу, арганізавалі працу па канвеерным прынцыпе, калі людзі, якія выконваюць розныя работы, тут жа змяняюць адзін аднаго. «Цяпер на доме задзейнічана больш за 20 чалавек, працуем па 12 гадзін, — расказаў галоўны інжынер, пры гэтым дадаў: — Любое зацягванне будаўніцтва непазбежна вядзе да яго падаражання, чаго мы і імкнёмся пазбягаць».




І яшчэ галоўны інжынер з гонарам паведаміў: «Закрываем у горадзе чаргу 2008 года». Гонар зразумелы: да гэтай акцыі прыкладваюць сваю руку і будаўнікі мехкалоны.

Апошнім часам Новалукомская механізаваная калона істотна абнавіла свой тэхнічны парк. Ён тут адносна невялікі — налічвае каля 25 адзінак рознай тэхнікі, а вось паказчыку яе амартызацыйнага зносу могуць пазайздросціць многія: усяго каля 40 працэнтаў. Пэўная абмежаванасць сілаў і сродкаў вымушаюць спецыялістаў ПМК-58 да карпатлівага пошуку больш танных варыянтаў. Так, тут могуць пахваліцца зусім нядаўнім набыткам — экскаватарам «Хундай», за які аддалі «ўсяго» 380 мільёнаў рублёў — у той час як аналагічны расійскі кашту нашмат больш. На пытанне, як удалося набыць больш танны, у ПМК-58 адказваюць такім чынам: трэба ў інтэрнэт часцей заходзіць, і не па розных там дробязях... Асабліва ў калоне ганарацца сваім перасовачным (на шасі) растворабетонным вузлом. Гэта італьянская машына, якая сама сябе загружае інертнымі матэрыяламі, сама ж дакладна дазіруе іх у патрэбных прапорцыях і выдае таварны прадукт; яе прадукцыйнасць — на ўзроўні стацыянарных растворабетонных вузлоў, якія звычайна стаяць у механізаваных калонах. Такіх мабільных і эканамічных машын, якія могуць рыхтаваць растворабетонныя сумесі нават у паходных умовах, у краіне толькі некалькі, падкрэсліваюць у ПМК-58. З яе набыццём тут адпала неабходнасць у эксплуатацыі стацыянарнага вузла. У планах — набыццё іншай тэхнікі, а таксама — пашырэнне адпаведных тэхнічных магчымасцяў і аснашчанасці. Добрае развіццё сваёй матэрыяльна-тэхнічнай базы ў ПМК-58 звязваюць з адпаведным указам Прэзідэнта краіны, згодна з якім належным чынам няблага аснасціліся многія будаўнічыя арганізацыі.







Безумоўна, уважлівае стаўленне да свайго тэхнічнага аснашчэння дазваляе калектыву ўпэўнена выконваць намечаныя планы. Летась аб'ём будаўніча-мантажных работ выкананы на 120 працэнтаў, сёлетні прырост павінен быць на ўзроўні 30 працэнтаў. «Не хапае людзей, асабліва — муляраў, а пад нашу цяперашнюю матэрыяльна-тэхнічную базу можна было б мець чалавек на 50 больш, а адпаведна — мець і большыя аб'ёмы. Гэтых аб'ёмаў цяпер у раёне хапае», — зазначаюць у мехкалоне.

Адносна невялікі колькасны склад калектыву пры адначасовым выкананні практычна поўнага набору ўсіх будаўнічых работ вымушае яго дэталёва планаваць усю сваю дзейнасць, дакладна яе каардынаваць. Асабліва гэта датычыцца работы ў зімовых умовах. У ПМК-58, па сутнасці, рыхтуюцца да зімы загадзя: закладваюць нулявыя цыклы дамоў, фармуюць (так бы мовіць, у запас) неабходныя жалезабетонныя вырабы (гэта звязана з тым, што тут адсутнічае спецыяльнае прапарванне жалезабетону, і ён набывае сваю цвёрдасць і трываласць у натуральных умовах). Адным словам, пра надыход зімы і пра адпаведную падрыхтоўчую кампанію калектыву не трэба і аб'яўляць. У гэтым плане асабліва павучальным стаў сёлетні год, калі мехкалоне раптам даручылі ўзвесці першы шматкватэрны дом у Новалукомлі, і падрыхтоўку фундамента пад яго давялося рабіць у зямлі, моцна скаванай маразамі.

Патрабаванні да якасці жылля, да яго спажывецкіх характарыстык, а значыць, і патрабаванні да будаўнікоў растуць. У гэтым плане крыху нечаканым для будаўнікоў ПМК-58 стала рашэнне Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва адносна таго, каб пры аддзелцы і здачы кватэр былі цалкам улічаныя ўсе пажаданні забудоўшчыкаў: якія мець шпалеры ў сваёй кватэры, дзверы і г.д. «Безумоўна, гэта дадасць нам клопату, аднак рашэнне прынятае, і яго трэба выконваць. Тым больш гэта ў інтарэсах забудоўшчыкаў, спажыўцоў», — зазначае кіраўнік арганізацыі. Тут жа варта дадаць: будаўнічыя пляцоўкі ПМК-58 рэгулярна наведвае тэхнічны нагляд заказчыкаў, буднагляд. У калектыве цяпер рыхтуюцца да атэстацыі сваёй работы згодна з міжнароднымі стандартамі ІСО 9001. Што не зусім задавальняе калектыў у тых жа пытаннях якасці? У ПМК-58 гэтага не хаваюць: нізкія эксплуатацыйныя характарыстыкі драўлянастружкавых пліт, якімі (згодна з праектамі) даводзіцца масціць падлогу ў шматкватэрных дамах. Адпаведныя нараканні, зразумела, паступаюць не на адрас вытворцаў ДСП, а на адрас будаўнікоў. Варта дадаць, што гэтыя пліты ўжо, па сутнасці, многія спісалі як матэрыял для падлогі, і да яго «працiскання» ў праекты, можна меркаваць, прыкладваюць руку яго ж непасрэдныя вытворцы.

Як рыхтуюцца ў ПМК-58 да свайго прафесійнага свята (дакладней — тут да яго, на момант выхаду матэрыялу, няйначай, ужо падрыхтаваліся)?

— Пугачовай і іншых зорных знакамітасцяў не будзе, не запрашалі, але і не трэба, — адзначаў кіраўнік мехкалоны Мікалай Васюк, — мы і самі нядрэнна ўмеем спяваць. Практычна ўсе атрымаюць прэміі, і найбольшымі будуць яны ў тых, хто першымі прыйшлі на гэтую пляцоўку, дзе цяпер знаходзіцца база ПМК і дзе раней было забалочанае месца. Ведаеце, нам давялося на 2,5 метра насыпаць тут зямлю... Наша работа, можа, і не такая прыкметная, як у буйных будаўнічых арганізацыях, але мы робім не менш важную справу: мы будуем жыллё, якое так патрэбна для многіх нашых суайчыннікаў, у тым ліку і для жыхароў нашага цудоўнага горада Новалукомля.

Усіх працаўнікоў ПМК, усіх калег віншую з нашым прафесійным святам!

**Іван БАРАНОЎСКІ.**
*УНП 300015917.*







**На здымках:**
**1. Кіраўнік Новалукомскай ПМК-58 Мікалай Васюк.**
**2. Першы шматкватэрны дом у Новалукомлі, узведзены будаўнікамі ПМК-58 сёлета.**
**3. Заўсёды шмат клопату ў інжынера-дыспетчара Ларысы Васюк.**
**4. Галоўны інжынер ПМК-58 Аляксандр Сакалоўскі.**
**5. На лентачнай пілараме працуюць Зміцер Мішулкоў і Яўген Астрэйка.**
**6. Удачную навінку набылі ў ПМК-58 — мабільны «растворабетонны вузел». На здымку бетоншчыкі Павел Сідаркові, Уладзімір Крывіцкі і вадзіцель машыны-бетонамяшалкі Сяргей Карпушонак.**
**7. Брыгада маляроў-тынкоўшчыкаў на будаўніцтве новага дома.**
**8. На новабудоўлі ў горадзе Новалукомлі.**
**9. Індывідуальныя жылыя дамы, пабудаваныя калектывам ПМК-58 у аграгарадку Лукомль.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

---

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.31 | 20.58 | 15.27 |
| Віцебск — | 5.16 | 20.53 | 15.37 |
| Магілёў — | 5.21 | 20.48 | 15.27 |
| Гомель — | 5.24 | 20.39 | 15.15 |
| Гродна — | 5.48 | 21.13 | 15.25 |
| Брэст — | 5.54 | 21.07 | 15.13 |

### Месяц
***Апошняя квадра 3 жніўня. Месяц у сузор'і Блізнятаў.***

### Імяніны
***Пр.*** *Хрысціны, Георгія, Глеба, Давыда, Мікалая, Палікарпа, Рамана.*

***К.*** *СПАС (Перамяненне Пана), Славаміра, Сцяпана, Якуба.*







## Дзве даты

### 6 жніўня

**1840 год** — нарадзіўся (в. Калацічы, сёння Глускі раён Магілёўскай вобласці) Альгерд Абуховіч, беларускі пісьменнік. Вучобу атрымаў у Слуцкай гімназіі, Многа падарожнічаў, жыў у Жэневе, Парыжы. Разам з Ф. Багушэвічам з'яўляецца заснавальнікам жанру байкі ў беларускай літаратуры. Аўтар баек «Воўк і лісіца», «Суд», «Старшыня» і іншых. Перакладаў творы І. Крылова, А. Пушкіна, М. Лермантава, У. Сыракомлі. Творы і пераклады Абуховіча пры ягоным жыцці распаўсюджваліся ў рукапісах. Памёр у 1898 годзе.



**1945 год** — амерыканцы скінулі атамную бомбу на японскую Хірасіму. У выніку выбуху, які адбыўся на вышыні 580 метраў, загінулі больш як 80 тысяч чалавек. Да канца года ад прамянёвай хваробы памерлі яшчэ 40 тысяч. Сёння адзначаецца Дзень Хірасімы — Сусветны дзень барацьбы за забарону ядзернай зброі.

## Цытата дня:

***«Які ж неразумны чалавек, калі ад дабра, якое ён мае, ён шукае другога. Не задавальняючыся тым, што ў яго ёсць, і ганяючыся за большым, чалавек траціць і тое, што меў».***

**Маргарыта Наварская (1492—1549), французская пісьменніца.**

## 7710 РУБЛЁЎ ДЛЯ САЛДАТАЎ ТЭРМІНОВАЙ СЛУЖБЫ

### складае кошт агульнавайсковага пайка

Як паведаміў начальнік харчовага ўпраўлення Міністэрства абароны Рыгор Голуб, нормы забеспячэння для ваеннаслужачых пастаянна ўдасканальваюцца. З улікам рэкамендацый спецыялістаў Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра гігіены Міністэрства аховы здароўя быў распрацаваны і з 1 красавіка гэтага года зацверджаны новы склад пайкоў. У агульнавайсковы, напрыклад, дадаткова ўведзены 20 г смятаны, 15 г сычужнага сыру, а 40 г каўбасных вырабаў заменены на такую ж колькасць мяса птушкі. Салдаты сталі штодня атрымліваць полівітаміны, курынае яйка, ужываць больш сокаў. Разам з тым у рацыёне зменшана колькасць хлеба, бульбы і цукру.

**Ігар ГОЛАД,**
**«Мінск-Навіны».**

ТУРЫСТЫЧНАЕ АГЕНЦТВА «ГІСТОРЫЯ-ТУР»
- Тур на фестываль «Гальшанскі замак», 21.08.2010 (папярэдні продаж квіткоў і арганізаваная дастаўка транспартам)
- Аўтобусныя экскурсіі па Беларусі
- Адпачынак у Еўропе і на моры
- Карпаратыўны адпачынак у шляхецкім фальварку Карчэўскіх, што ў Бянюнах
- Шэнгенскія візы
(029) 677 00 46 www.h-t.by

## ПРАДАЕЦЦА

❐ Кватэра 3-пакаёвая ў г.п. Карма Гомельскай вобл., 4-ы паверх 5-павярховага дома (64 кв. м, жыл. пл. 43,8 кв. м), 25 тыс. у.е.

Тэл. 8 029 354 63 62 (пасля 18.00).

❐ Участак 10 сотак на беразе Лепельскага возера побач з пансіянатам «Лад 7».

Тэл.: МТС 890 76 99, 591 95 48.

❐ Дом у в. Жыровічы Слонімскага р-на Гродзенскай вобл.

Тэл.: 8 029 879 23 02, (8017) 964 23 95.